# Раздел 1
# ТЕОРИЯ И ИСТОРИЯ АРХИТЕКТУРЫ

**УДК 726. 54 (476)**

## РОЛЯ СУЧАСНАГА ПРЫХАДСКОГА ХРАМА Ў СТРУКТУРЫ ГАРАДСКІХ І СЕЛЬСКІХ ПАСЕЛІШЧАЎ (1990–2009 гг.)

**Арабей В.**
Ассистент, кафедра «Архитектура жилых и общественных зданий», БНТУ

*Разглядаецца роля сучаснага прыхадскога праваслаўнага храма ў архітэктурнай кампазіцыі гарадскіх і сельскіх паселішчаў. Вызначаны характэрныя тыпы і характарыстыкі прыхадскіх храмаў паводле размяшчэння іх у структуры населеных пунктаў. Распрацаваны прапановы па эфектыўным выкарыстоўванні горадабудаўнічых якасцяў прыхадскіх храмаў у архітэктурнай кампазіцыі паселішчаў.*

*Уводзіны.* Аналіз сучаснага храмабудаўніцтва дае магчымасць сцвярджаць, што прыхадскі храм з'яўляецца найбольш распаўсюджаным тыпам праваслаўных пабудоў і адыгрывае асноўную ролю ў духоўна-культурным выхаванні вернікаў. Напрыклад, размяшчэнне храма ў структуры паселішча ў дарэвалюцыйны час рэгламентавалася будаўнічым статутам Расійскай імперыі, згодна з якім для праваслаўных цэркваў вылучаліся лепшыя месцы на цэнтральных плошчах.

Сённяшняя практыка храмабудавання мае розныя кампазіцыйныя прыёмы горадабудаўнічых рашэнняў, і шмат у якіх згублена ўсведамленне асаблівай значнасці прыхадскога храма як аднаго з горадаўтваральных элементаў паселішча. У сувязі з гэтым, актуальнай з'яўляецца распрацоўка рэкамендацый, якія б дазволілі ў поўнай меры рэалізаваць патэнцыял прыхадскога храма як аднаго з галоўных элементаў архітэктурнай кампазіцыі горада.

*Асноўная частка.* Праведзенае даследаванне дазволіла вылучыць два этапы размяшчэння сучасных прыхадскіх храмаў у структуры паселішчаў:

- першы этап (1990-я гады), калі месцы для будаўніцтва храмаў не былі прадугледжаны раней распрацаванымі генеральнымі планамі і размяркоўваліся спантанна на вольных, часта непрывабных тэрыторыях. Следствам гэтай сітуацыі стаў шэраг праблем. Храмы ўзводзіліся ў неспрыяльнай горадабудаўнічай сітуацыі (перыферыйныя раёны, глыбіні жылой забудовы, нізінныя тэрыторыі і г.д.). Прыкладам можа служыць Свята-Успенская царква ў Чавусах, шчыльна акружаная сядзібнай забудовай; храм у гонар Раства Хрыстова п. Ялізава, Асіповіцкі р-н, размешчаны ў глыбіні ляснога масіву; Свята-Мікалаеўскі храм у Мінску, пабудаваны ў нізіне і адлучаны насыпам ад забудовы мікрараёна.
- другі этап (2000-я гады) характарызуецца распрацоўкай схемы размяшчэння культавых аб'ектаў у складзе новых генеральных планаў паселішчаў. На прыкладзе Мінска можна ўбачыць, што выкарыстанне прапанаваных спецыялістамі «Мінскграда» пляцовак для культавых аб'ектаў дало станоўчыя вынікі. Былі рэалізаваны наступныя горадабудаўнічыя прыёмы: візуальнае раскрыццё будынка храма адносна асноўных накірункаў яго ўспрымання (царква ў гонар Святых вялебных Опцінскіх старцаў); выкарыстанне асаблівасцяў рэльефу (Свята-Крыжаўзвіжанскі храм) і г.д.

Нягледзячы на названыя змены, становішча з размяшчэннем прыхадскіх храмаў у грамадскіх цэнтрах застаецца дастаткова складаным, асабліва ў буйных гарадах, дзе зарэзерваваныя на генеральным плане горада і прадугледжаныя ў плане дэталёвай планіроўкі храмы на стадыі аб'ёмнага праектавання часта передаюцца пад жылую або грамадскую забудову. Такім чынам, неабходнасць будаўніцтва храма ў будучым вырашаецца выкарыстоўваннем рэкрэацыйных тэрыторый, страта якіх негатыўна ўплывае на жыццядзейнасць паселішчаў.

Паводле размяшчэння ў паселішчах можна вылучыць два асноўныя тыпы сучасных прыхадскіх храмаў: гарадскія і сельскія. Гарадскія храмы падзяляюцца па:

а) адміністрацыйным статусе паселішча: сталіца, абласны цэнтр, цэнтр адміністрацыйнага раёну, іншыя гарады, пасёлкі гарадскога тыпу;

б) велічыні паселішча: найбуйнейшыя (звыш 1 млн. чал), буйныя (250 тыс. – 1млн. чал.), вялікія (100 – 250 тыс. чал.), сярэднія (20 – 100 тыс. чал.), малыя (да 5 – 20 тыс. чал.) [2, 5].

Сельскія храмы падзяляюцца па:

а) адміністрацыйным статусе паселішча: аграгарадкі, адміністрацыйныя цэнтры (сельсаветы), іншыя сельскія паселішчы;

б) велічыні паселішча: буйныя (звыш 1000 чал), вялікія (500 – 1000 чал.), сярэднія (100 – 500 чал.), малыя (50 – 100 чал.) [2, 5].

Адмысловае месца займаюць храмы сельскіх паселішчаў, якія знаходзяцца па суседстве з найбуйнейшымі гарадамі (прыгарадныя), іх архітэктура вылучаецца высокім узроўнем. Прыкладам можа служыць Свята-Раства-Багародзіцкая царква в. Тарасава, Мінскага р-на, якая мае адмысловае кампазіцыйнае рашэнне і размешчана на маляўнічым узгорку, што дазваляе ёй займаць дамінуючае становішча сярод малапавярховай забудовы.

Аднымі з асноўных характарыстык прыхадскога храма з'яўляюцца: умяшчальнасць, рэжым набажэнстваў і наведвання (сацыяльная і культурная дзейнасць прыходу), якія ў значнай ступені і вызначаюць месца будаўніцтва царквы ў структуры паселішча. Умяшчальнасць разлічваецца ў залежнасці ад колькасці насельніцтва селіцебнай тэрыторыі і арыентыровачна складае 10%, прычым 7,5% наведвае набажэнствы па святочных днях [4, 23], дадзены паказчык вар'іруецца ў залежнасці ад духоўных і культурных традыцый рэгіёна.

Гарадскія прыхадскія храмы паводле умяшчальнасці маюць наступнае дзяленне: малыя (70 – 300 чал.), сярэднія (300 – 750 чал.), вялікія (750 – 1500 чал.), буйныя (больш 1500 чал.) [1,83]. У вялікіх і буйных храмах набажэнствы адбываюцца, як правіла, штодзённа, акрамя панядзелку. У сярэдніх і малых – субота (вечар), нядзеля (раніца) і святочныя дні.

Для сельскіх прыхадскіх храмаў намі прапанавана наступнае дзяленне паводле умяшчальнасці: малыя (да 70 чал.), сярэднія (70 – 300 чал.), вялікія (300 – 750 чал.), буйныя (750 – 1500 чал.). У вялікіх і буйных храмах набажэнствы адбываюцца, як правіла – субота (вечар), нядзеля (раніца) і святочныя дні; у сярэдніх – нядзеля (раніца) і святочныя дні; у малых – эпізадычна.

Прыхадскі храм можа ўваходзіць у архітэктурную кампазіцыю горада як асобная пабудова альбо як духоўны комплекс. Першы падыход дазваляе стварыць вялікі па аб'ёму будынак храма, часта суразмерны шматпавярховай індустрыяльнай забудове. Дасягаецца гэта размяшчэннем памяшканняў球 рознага прызначэння ў адным аб'ёме. Адмоўны бок такога рашэння – неабходнасць сур'ёзнага фінансавання і немагчымасць эксплуатацыі ў працэсе будаўніцтва (Свята-Ўваскрасенскі храм, Мінск (гл. цветн вкл. мал.1)).

Другі падыход складаецца з узвядзення розных пабудоў духоўнага комплексу, будаўніцтва якіх можна весці паэтапна з невялікімі грашовымі выдаткамі і ўласнымі сіламі. Адмоўным бокам з'яўляецца дробнамаштабнасць пабудоў комплексу, як правіла, не сумаштабных архітэктуры кварталаў і мікрараёнаў, працяглыя інжынерныя камунікацыі (Свята-Духаўская царква, п. Гатава, Мінскі р-н (гл. цветн вкл. мал.2)).

Прыхадскі комплекс звычайна складаецца з храма, паклоннага крыжа, прыхадскога дому, нядзельнай школы, званіцы. Дадатковымі пабудовамі могуць быць: хрысцільны храм, вадасвятная капліца, крыніца, уваходная брама, крама царкоўнага начыння, майстэрні і інш.

Важнай горадабудаўнічай задачай з'яўляецца стварэнне ансамбля з названых пабудоў, які б гарманічна ўваходзіў у кампазіцыю паселішча (комплекс Свята-Міхайлаўскага храма, Бяроза).

Функцыянальная насычанасць прыхадскога праваслаўнага комплекса ў першую чаргу звязана з кантынгентам жыхароў (узрост, канфесійная прыналежнасць асноўнай масы людзей дадзенага раёну, духоўныя і культурныя

традыцыі і г.д.). Асноўнай функцыяй з'яўляецца богаслужбовая; дадатковымі – навучальная, выхаваўчая, дабрачынная, гаспадарчая.

Для гарадскіх прыхадскіх храмаў характэрна больш разгалінаваная структура дадатковых функцый у параўнанні з сельскімі цэрквамі, дзе часта ўсё абмяжоўваецца толькі богаслужбовай. Такім чынам, важным фактарам у праектаванні гарадскіх прыхадскіх комплексаў з'яўляецца магчымасць перспектыўнага развіцця. Як ілюстрацыю дадзеных тэндэнцый можна прывесці прыклады: у найбуйнейшым горадзе – прыход Пакрова Прасвятой Багародзіцы ў Мінску, дзе напачатку была пабудавана невялікая царква ў гонар абраза Божай Маці «Крупецкі», потым асноўны Свята-Пакроўскі храм, прыхадскі дом, званіца; у малых – Свята-Духаўскі прыход п. Гатава, Мінскі р-н, дзе пасля пабудовы храма, брамы-званіцы і вартоўні плануецца ўзвядзенне прыхадскога дому з нядзельнай школай.

Прыкладам сельскіх прыходаў, у якіх патрэбы абмежавалася толькі храмавай пабудовай, могуць служыць Свята-Андрэеўская царква в. Комсенічы, Круглянскі р-н; Свята-Ефрасіннеўская царква в. Варонча, Навагрудскі р-н.

Асаблівую ўвагу варта звярнуць на немагчымасць пашырэння тэрыторыі прыходу ва ўмовах цэнтральных частак гарадоў, дзе для далейшага будаўніцтва выкарыстоўваюцца парадна-ўваходныя і іншыя зоны, што стварае заціснутыя прасторы, якія правакуюць канфліктныя сітуацыі пры вялікай колькасці вернікаў падчас святочных набажэнстваў (Свята-Петра-Паўлаўскі храм, Бяроза).

Адпаведна з праведзеным даследаваннем можна вылучыць асноўныя месцы размяшчэння сучасных прыхадскіх храмаў:

- у найбуйнейшых, буйных і вялікіх гарадах: жылая і рэкрэацыйная тэрыторыя, вуліцы раённага і мясцовага значэння, праезды;
- у сярэдніх і малых гарадах: грамадскія цэнтры, жылыя, рэкрэацыйныя і мемарыяльныя тэрыторыі, галоўныя і мясцовыя вуліцы, праезды;
- у сельскіх паселішчах: грамадскія цэнтры, жылыя, рэкрэацыйныя і мемарыяльныя тэрыторыі, галоўныя і мясцовыя вуліцы.

Найлепшымі тэрыторыямі для размяшчэння прыхадскіх храмаў з'яўляюцца грамадскія цэнтры, прыклад чаго мы бачым у сельскіх, сярэдніх і малых гарадскіх паселішчах. Але, як паказвае практыка, дадзены падыход не знаходзіць месца ў найбуйнейшых, буйных і вялікіх гарадах.

Можна вылучыць два асноўныя варыянты размяшчэння храма на плошчы. Першы – у цэнтры (Свята-Ефрасіннеўская царква, п. Івянец, Валожынскі р-н (гл. цветн вкл. мал.3), дзе будынак грае ключавую ролю грамадскага цэнтра. Другі – у перыметральнай забудове плошчы (храм у гонар абраза Божай Маці «Бялыніцкі», Бялынічы), дзе царква з'яўляецца адным з важных элементаў кампазіцыі.

Другім па прыярытэтнасці месцам для размяшчэння прыхадскога храма з'яўляецца рэкрэацыйная тэрыторыя як у гарадскіх, так і ў сельскіх паселішчах. Прыкладам можа служыць размяшчэнне Свята-Аляксандра-Неўскай царквы ў Гомелі, дзе архітэктура храма гарманічна спалучылася з ландшафтным наваколлем.

Будаўніцтва храмаў у рэкрэацыйных зонах дазваляе ствараць маляўнічыя рашэнні з актыўным выкарыстаннем асаблівасцяў рэльефу, спалучэння адкрытых прастораў і зялёных масіваў, люстэркавых якасцяў водных паверхняў. Можна прывесці некалькі варыянтаў ужывання дадзенага прыёму. Першы, калі храм размешчаны на беразе вадаёма побач з абрэзам вады і различаны на найбольш выгаднае ўспрыманне з воднай паверхні (Храм у гонар абраза Божай Маці «Мінскі» на Чыжоўскім вадасховішчы, Мінск). Другі, калі будынак храма адлюстроўваецца ў вадзе і асноўнае ўспрыманне различана з сушы, на невялікай адлегласці (Свята-Праабражэнская царква, Смаргонь). Трэці, калі храм і водная паверхня знаходзяцца на дастаткова вялікай адлегласці і прадугледжана панарамнае ўспрыманне з супрацьлеглага берага (Свята-Мікалаеўская царква, п. Коханава, Талачынскі р-н ).

Акрамя таго актыўна выкарыстоўваюцца такія прыёмы, як размяшчэнне храмаў на адкрытых прасторах паселішчаў (Свята-Богаяўленская царква, Глуск) і ўзвышаных

пляцоўках (Свята-Троіцкі храм, Мядзел (гл. цветн вкл. мал.4)).

Гэта дазваляе храму заняць важнае палажэнне ў жылой забудове з раскрыццём візуальнага ўспрымання адносна галоўных пешаходных і аўтамабільных восяў (Свята-Раства-Багародзіцкі храм, Салігорск).

Разглядаючы размяшчэнне прыхадскіх храмаў на жылых тэрыторыях, можна вылучыць тры асноўныя варыянты. Першы, калі храм месціцца на рагу жылога ўтварэння і з'яўляецца горадабудаўнічым акцэнтам, кантрастуючы з індустрыяльнай забудовай (храм у гонар Святой праведнай Сафіі Слуцкай, Мінск (гл. цветн вкл. мал.5)).

Другі, калі будынак царквы знаходзіцца ў шэрагу жылых дамоў і губляе свой горадабудаўнічы патэнцыял (храм у гонар Святога пакутніка немаўляткі Гаўрыіла Беластоцкага, Іўе). Трэці, калі храм з усіх бакоў акружаецца жыллём і страчвае візуальныя сувязі з асноўнымі напрамкамі ўспрымання (Свята-Іаана-Кармянская царква, Гомель).

Прыярытэтнымі варыянтамі размяшчэння прыхадскога храма адносна транспартных восяў з'яўляецца замыканне восі Т-падобнага скрыжавання (Свята-Леанідаўскі храм, Орша) і замыканне перспектывы пры змене напрамку дарогі (Свята-Крыжаўзвіжанская царква, в.Святая Воля, Івацэвіцкі р-н). Да станоўчых прыкладаў можна аднесці: храм у гонар абраза Божай Маці «Ціхвінцкі» ў Брэсце, які знаходзіцца на скрыжаванні вуліц раённага значэння і выступае ў якасці візуальнага арыенціру; Свята-Мікалаеўскую царкву ў Беразіно, якая размешчана на галоўнай вуліцы горада, дзякуючы чаму заняла дамінантнае становішча (гл. цветн вкл. мал.6).

Непрывабнымі з'яўляюцца рашэнні, пры якіх будынак храма камуфлюецца, знаходзячыся на другасных дарогах (Свята-Мікалаеўская царква, Брагін) і праездах (храм у гонар абраза Божай Маці «Уладзімерскі», Мінск).

Пры размяшчэнні храма ў прыватнай і квартальнай забудове з невялікай павярховасцю ствараюцца спрыяльныя ўмовы для выкарыстання адмысловага сілуэта храма, яго дамінуючага палажэння сярод наваколля (Свята-Панцеляймонаўская царква, Ліда).

Размяшчаючы храм у мікрараёнах з шматпавярховай забудовай, якая пераўзыходзіць па вышыні храм, немагчыма дасягнуць дамінантнага становішча традыцыйнымі сродкамі. Асаблівую ўвагу варта звярнуць на пластычнае рашэнне будынка храма, якое дазволіць вылучыць яго з фонавай забудовы (Свята-Троіцкі храм, п. Бараўляны, Мінскі р-н).

Важнай характарыстыкай храма з'яўляецца пешаходная дасягальнасць для жыхароў найбліжэйшых дамоў, якая не павінна перавышаць 25 хвілін (1 – 1,5 км) [4, 23]. У сувязі з вялікай колькасцю вернікаў сталага ўзросту і з фізічнымі абмежаваннямі, асаблівую ўвагу патрэбна звярнуць на стварэнне бесперашкоднага асяродку.

Ва ўмовах недастатковай колькасці прыхадскіх храмаў большая частка вернікаў карыстаецца транспартнымі паслугамі. Важным з'яўляецца стварэнне зручнай сувязі з прыпынкамі грамадскага транспарту і забеспячэнне неабходнай колькасці парковак для асабістага транспарту.

Для правядзення рэлігійных абрадаў (хрышчэння, вянчання, адпявання, асвячэння машын і інш.) неабходна прадугледзець невялікую колькасць парковак у непасрэднай блізкасці ад храма.

У большасці выпадкаў гарадскія прыхадскія храмы і комплексы падлучаюцца да цэнтралізаваных сетак водазабеспячэння, ацяплення, каналізацыі, сельскія маюць аўтаномныя рашэнні. Усе разгледжаныя прыхадскія храмы электрафікаваны. Пры адсутнасці цэнтралізаванага водазабеспячэння робяцца свідравіны, а для забеспячэння гарачай вадой выкарыстоўваецца злектрападагрэў. Каналізацыя складаецца з двух частак: вада, якая засталася пасля таінстваў, адводзіцца ў спецыяльныя дрэнажныя калодцы; фікальна-гаспадарчыя сцёкі скідаюцца ў цэнтралізаваную каналізацыю альбо выграбныя ямы, якія размяшчаюцца на вялікай адлегласці ад будынка храма.

Пры адсутнасці цэнтралізаванага забеспячэння цяплом выкарыстоўваецца шэраг разнастайных рашэнняў: катлы на цвёрдым паліве і газе, электраабагрэў. Час ад часу

сустракаюцца уласныя кацельныя, на размяшчэнне якіх у структуры комплекса патрэбна звярнуць асаблівую ўвагу ў сувязі з тым, што дадзеныя пабудовы маюць вялікія коміны, якія ствараюць асаблівы сілуэт.

*Высновы:* Праведзенае даследаванне дазволіла зрабіць высновы аб тым, што размяшчэнне сучасных прыхадскіх храмаў у структуры паселішчаў не заўсёды адпавядае традыцыйнай горадабудаўнічай значнасці будынка царквы як аднаго з асноўных элементаў архітэктурнай кампазіцыі, цэнтра духоўна-культурнага жыцця вернікаў.

Можна даць шэраг рэкамендацый, якія дапамогуць раскрыць горадабудаўнічы патэнцыял прыхадскіх храмаў:

- у сувязі с тым, што прадугледжаныя ПДП праваслаўныя храмы пры аб'ёмным праектаванні часта замяняюцца грамадскімі і жылымі аб'ектамі, прапануецца стварыць закон, згодна з якім культавыя пабудовы мелі б асаблівы статус прыярытэтнага размяшчэння;
- вялікі кошт зямельных участкаў у найбуйнейшых, буйных і вялікіх гарадах стварыў умовы, пры якіх храмы былі выцеснены з цэнтральных плошчаў. У выніку архітэктура цэнтральных частак гарадоў згубіла адзін з асноўных кампазіцыйных элементаў, горадабудаўнічую дамінанту. Для рашэння названай сітуацыі прапануецца даць ільготы для будаўніцтва культавых аб'ектаў;
- перапоўненасць храмаў у святочныя дні і недахоп стаянак побач з імі стварае канфліктныя сітуацыі. Для іх рашэння прапануецца раўнамернае размяшчэнне храмаў у структуры горада, што мінімізуе транспартныя перамяшчэнні і забяспечыць пешаходную даступнасць прыхадскіх комплексаў;
- размяшчэнне ў неспрыяльных горадабудаўнічых умовах перашкаджае раскрыццю адмысловых архітэктурна-мастацкіх якасцяў прыхадскіх комплексаў.

Важным з'яўляецца акцэнтаванне ўвагі на такіх горадабудаўнічых рашэннях, як: дамінантнае становішча храма ў прыродным і антрапагенным ландшафце; раскрыццё адносна асноўных візуальных восяў; актыўнае выкарыстоўванне сілуэта храма пры стварэнні панарамных відаў паселішча; выкарыстоўванне асаблівасцяў рэльефу і іншых прыродных фактараў для стварэння маляўнічых краявідаў; арганізацыя сакральнай прасторы вакол храма з паступовым пераходам яе да паўсакральных і прафанных.

*Літаратура:*

*1. Возняк, Е.Р. Архитектура современной православной приходской церкви (на примере Санкт-Петербурга): дис. … канд. арх.: 18.00.02 / Е.Р. Возняк - 1996. - 183 л.*

*2. Градостроительство. Планировка и застройка населённых пунктов=Горадабудаўніцтва. Планіроўка і забудова населеных пунктаў.: СНБ 3.01.04-02. Введ. 01.07.03. Минск УП «БЕЛНИИПГРАДОСТРОИТЕЛЬСТВА», 2003. - 84 с.*

*3. Иодо,И.А., Протасова, Ю.А. Городские пространства сакрального типа / И.А. Иодо, Ю.А. Протасова // Градостоительство и архитектура: актуальные проблемы: сб. научн. тр. / Бел. нац. технич. ун-т; архитектурный факультет.; под ред. Г.В. Полянской - Минск: Тэхналогія, 2002. - С. 50-55.*

*4. Культовые здания и сооружения. Здания, сооружения и комплексы православных храмов. Правила проектирования=Культавыя будынкі і збудаванні. Будынкі, збудаванні і комплексы праваслаўных храмаў. Правілы праектавання: ТКП 45-3.02-83-2007. Введ. 01.04.08. Минск - РУП «Стройтехнорм», 2008. - 44 с..*

***Arabei V.***

**THE ROLE OF A PARISH TEMPLE IN THE ARCHITECTURAL COMPOSITION OF CITY AND RURAL SETTLEMENTS (1990-2009)**

*The role of a modern parish temple in the architectural composition of city and rural settlements is considered. Characteristic types and characteristics of parish temples are established. Recommendations on an effective use of town-planning properties of parish temples in an architectural composition of settlements are develop.*